Российская Центральная Книжная Палата
Екатеринославск. № 3680
тираж

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

Штодзенная газэта.

Адрас рэдакцыі й адміністрацыі:
Менск, Петрапаўлаўская, № 8 пры Госіздаце.

Рукапісы, прысланыя бяз зваротнага адрасу й не апісаныя ім, не вяртаюцца. Не прынятыя ў друк рукапісы аўтарам не вяртаюцца.

ДРУГІ ГОД ВЫДАНЬНЯ.

ВЫДАНЬНЕ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ.

№ 174 (284) Аўторак, 9-га жніўня 1921 г.

Москва. Наркомнац. пер. отд. агит. и пропаг. Любел
Ю. Сфел

Белагвардзейскі бай.

Белагвардзейцы розных колераў, пачынаючы ад эс-эраў і меншавікоў і канчаючы самымі заядлымі прыхільнікамі памешчыкаў і капіталістаў, ніколі ня скупіліся на абяцанкі. У белагвардзейскіх газэтах і ў эс-эраўскіх праклямацыях мы і да цяперашніх часоў чытаем аб тых „залатых горах", якія яны абяцаюць, асабліва сялянству. Яны іх вызваляць ад „барбараў" бальшавікоў. Яны дадуць селяніну зямлю. Яны абробяць край. Яны зробяць саюз з іншымі дзяржавамі. Адным словам, яны ўсё зробяць, калі толькі сяляне і рабочыя скінуць сваю рабоча-сялянскую ўладу і зноў пусьцяць іх да кіраўніцтва. Рабочыя даўно ўжо ведаюць запраўдны кошт гэтым абяцанкам. Нават і з сялян дужа намнога знойдзецца такіх, ды й то самыя заядлыя кулакі, якія верылі хаця б слову з усяго таго, што кажуць і пішуць белыя.

Крэнштадзкае паўстаньне, у часе якога на сялянскай матросаў з'явіліся царскія генэралы і памешчыкі, заставецца надоўга ў памяці рабочых і сялян. Але калі б яны да гэтага часу і ня ведалі запраўднага твару белай гвардыі, дык здараньні, якія адбываюцца цяпер на далёкім Усходзе, маглі б іх асьвятліць з поўнай яскравасьцю. Японскія імпэрыялісты, жадаючы захапіць частку Сібіры, убачылі, што лепшымі сродкамі для гэтага будуць служыць тыя расейскія „патрыёты", якія больш усіх крычаць аб патрэбнасьці спасьці Расею ад бальшавікоў. І вось, дзякуючы падтрыманьню штыхоў японскіх драпежнікаў, два генэралы Сямёнаў і Меркулаў і цэлая куча драбнейшых генэральчыкаў, сталі часова гаспадарамі на Ўладывастоку і ў прылягаючай к яму вобласьці.

Паглядзімо ж, як гаспадарэць тыя, якія абяцаюць стаць „дабрадзеямі" Расеі.

„У Градзякове (месца, дзе жыве і знаходзіцца Сямёнаў) нарастае непаразуменьне паміж Сямёнавым і яго прыяцелямі на грунце грашовых знакаў. Вялікае непаразуменьне пагражае выліцца ў адкрыты бунт. Некаторыя генэралы пакідаюць Сямёнава, убачыўшы, што ў яго няма грошаў".

Вось у чым выяўляецца „патрыётызм" гэтых гэроеў.

Далей гета відаць яшчэ лепш: „Развал Сямёнаўскіх і Каралеўскіх бандаў ідзе пасьпешным тэмпам. Камандзеры аддзельных часцяў перавандроўваюць то на адну, то на другую старану. Генэралы тылу, пачуўшы смачны кусочак, кідаюцца на розныя авантуры і паўстаньні, прыцягваючы абдурачаных салдат, дзеля сваёй уласнай наживы, у гэтае змаганьне. Зложыўся цэлы штаб генэралаў-перабежчыкаў, якія сягоньня служаць Меркулаву, заўтра Сямёнаву, гледзячы на тое, хто больш дае грошаў". І далей „Спроба замірэньня паміж Меркулавым і Сямёнавым знова правалілася. Прэм'ер-міністар сямёнавец Іваноў, які быў залічан на гэту пасаду, загадам Меркулава, адхілен ад яе. Іншым міністрам Іванаўскага толку і погляду гэтак сама зроблена прапанаваньне падаць заяву аб адстаўцы. Згодна з загадам атамана Сямёнава яго вайсковыя часьці не павінны прымаць удзелу ў выбарах у меркулаўскае „народнае сабраньне".

Добрыя „вызваліцелі й спасіцелі"! Яны прадаюць сябе і сваіх салдат таму, хто больш дае. Яны грызуцца з-за грошаў. Яны бесперастанку сварацца за ўладу. І, напасьледак, яны гатовы прадаць і сябе і Расею японцам, каб толькі тыя добра заплацілі. І гэтыя падонкі людзей яшчэ абвіняюць Савецкую ўладу, якая чатыры гады ў посьпехам вядзе змаганьне з шматлікімі ворагамі працоўнікаў Савецкіх рэспублік, якая вызваліла іх ад прыгону капіталістаў і прымусіла драпежнікаў усяго сьвету прыняць свае прагавітыя і брудныя рукі ад Расеі.

Але замеры гэтых авантурнікаў даволі ўжо ясны для кожнага. Дні існаваньня іх ужо пералічаны. Аб гэтым досыць ясна кажуць тыя адносіны, якія яны спатыкаюць сярод жыхарства Далёка-Усходняй рэспублікі.

Вось што паведамляюць аб гэтым: „Большасьць жыхарства байкатуе выбары (ня прымае ўдзелу) ў меркулаўскае „народнае сабраньне", а ў тых мясцовасьцях, дзе пад пагрозай выбары адбыліся, дэпутаты з розных прычын застаюцца на мясцох і не выяжджаюць ва Ўладывасток". Гэтак адносяцца нават буржуйныя элементы. Што тычыцца пралетарыяў, дык яны абвясьцілі белагвардзейцам вайну і са зброяй змагаюцца з імі.

„Агульная забастоўка, кажа паведамленьне, цягнецца. Паўстанцкі рух абхваціў лінію чыгункі. Паўстанцы захапілі станцыю мучную. Зьнішчылі мост. Лік паўстанцаў усё больш і больш павялічваецца. Чырвоныя вывялі з порту 2 скарбовыя пароходы. Меркулаў баіцца слаць сваё войска супроць паўстанцаў. На выпадак, калі прыдзецца ўпякаць, меркулаўскія камандзеры пароходаў атрымалі загад быць гатовымі дзеля адплыцьця".

Гэтак распраўляюцца самі працоўнікі Далёка-Ўсходняй рэспублікі з царскімі генэраламі і памешчыкамі. Меркулаву, Сямёнаву і іншым „гэроям" нядоўга, мусіць, прыдзецца красьці на Далёкім Усходзе. Але іх прысутнасьць там пакажа яшчэ раз прыклад таго „раю", які абяцаюць белагвардзейцы ў сваіх праклямацыях. Чатырохгадовым змаганьнем працоўнікаў Савецкіх рэспублік, рабочых і сялян, удалося вызваліцца ад царскай брыды — генэралаў і памешчыкаў. І цяпер яны не дазволяць, каб пад якім бы там ня было сьцягам, эс-эраўскім, кадэцкім ці адкрыта — памешчыцкім, іх зноў вярнуць ім. Старыя часы адыйшлі ўжо ў нябыцьцё.

Сярод белых.

Праца Савінкава.

У нямецкіх газэтах зьявілася ў апошнія часы шмат цікавых паведамленьняў аб чынамі Савінкава. Выяўляецца, што у Савінкава былі ўкрадзены ня толькі грошы ў розным валюце, золата й брыльянты, але шмат сакрэтных паперэ і лістоў, якія цяпер сталі вядомы ўсім, і якія адзначаюць злую корную работу, якую вялі Савінкаў супроць Савецкай Расеі. Выяўляецца, што Савінкаў хаваў у сябе дакумэнты, якія адносіліся да яго дагавору з Польшчай. Ту ўзнаходзяцца: дакумэнты аб заснаваньні „Беларускай Рэспублікі" [illegible] Польшчы [illegible] Украіну, за што Польшчы аддаваліся на вечную ўласнасьць Заходнія паветы Падольскай і Валынскай губэрніі. За гэту дапамогу польскаму правіцельству Савінкаў атрымліваў вялікую пазыку „чэмасьніка беларускага краю".

Гэтак прадаваў Савінкаў беларускіх рабочых і сялян польскім панам, атрымліваючы за гэта ва-ролькі грошы й брыльянты, але і генэральную пасаду сатрапа. Зладзеі, абкрадаўшы яго, выкрылі вымадзтва, што рабілася ім у варшаўскіх палацах. Выяўляецца, што Савінкаў ня толькі займаўся зрадніцтвам, але й шулерствам. Адначасова з памянёнымі вышэй дакумэнтамі, украдзены сьпіс расейскіх упекачоў, якія кармілі палякоў і любілі пажыў, прычым гэтыя сьпісы былі дасланы ў архівах польскаму правіцельству вайсковым агентам генэрала Дзянікіна палкоўнікам Доўнарам. Сьпісы зробленыя прыблізным удзелам князя Шэрнэскага Шахматава. Выходзе, што за грошы Савінкаў служыў у польскай контр-разьведцы.

На ўсякі выпадак.

У англійскую палату дэпутатаў уносіцца пытаньне аб урэгульваньні армії. У гэтым пытаньні адзначаецца, што англійскае правіцельства ўсякім чынам імкнецца падтрымаць і павялічыць аўтарытэт Урангеля перад яго армією і спадзяецца пры дапамозе апошняй затрымацца надалей у Канстантынопалі, а можа нават пасылаць іх пры падходзячым выпадку супроць Савецкай Расеі.

Белагвардзейскі загавор.

Аранбург. 7. VIII. Згодна з пастановай калегіі. Самараванінскай губэрскай надзвычайнай камісіі, расстрэляна 32 чалавекі на прыяцьцё ўдзелу ў раскрытай белагвардзейскай арганізацыі.

Большасьць з расстрэляных Аранбурскія казакі, якія служылі ў армії Дутава і складалі асяродак белагвардзейскай арганізацыі.

Што чуваць заграніцай.

Пастанова Літоўскага сойму.

Літоўскі сойм з прычыны мемарандуму сяброў сойму пінякоў да Лігі Нацыяў ухваліў пастанову аб тым, што правіцельства павінна вясьці змаганьне супроць усіх, хто пагражае незалежнасьці Літвы.

Марское ўзброеньне.

Англійскі парламент зацьвердзіў праграму марскіх узброеньняў. Згодна гэтай праграме павінны быць тэрміново пабудаваны 4 вялікія ваенныя карабелі.

Фінскія рабочыя й сяляне з намі.

ГЭЛЬСІНГФОРС. 5. 8. Фінскія рабочыя арганізацыі, выступіўшыя на дапамогу галодаючым Расеі, у сваёй адозьве адзначаюць, што кіраўнікі фінскай сацыял-дэмакратычнай партыі ўчынілі цяжкі праступак супроць расейскіх рабочых і сялян. Яны свае добрыя адносіны ў адносінах к Савецкай Расеі выказвалі толькі на словах. Цяпер пад вымаганьнем сяброў партыі згодніцкія кіраўнікі будуць прымушаны прыняць крокі, каб пакаяцца расейскім рабочым і сялянам. Фінскія рабочыя арганізацыі стаяць гэтак [illegible] Савецкую Расею, і абавязчаньне рашучай барацьбы выкрыцьцё злачынных праць супроць Савецкай Расеі. У выпадку невыкананьня гэтых патрыкаў фінскія рабочыя арганізацыі адмаўляюцца працаваць разам з Сацыял-дэмакратамі.

Эканамічнае становішча Скандынавіі.

Скандынаўскія дзяржавы (Швецыя й Нарвегія) адчуваюць на трэбу адмаўленьня гандлю з Расеяй. Гета дасьць магчымасьць адрадзіць іх гаспадарку, якая цяпер знаходзіцца ў вельмі цяжкім становішчы. У Швецыі зьнешняя й стальная прамысловасьць працуе на чверць свайго звычайнага вытвору, паперовыя фабрыкі — на 40% мясныя заводы — на 15% свайго звычайнага выробу. Шмат рабочых выкінута безработьцем. У Нарвегіі вялікі недахват хлеба й рыбы.

Дэмакратычныя правіцелі.

РЫГА, 4.VIII. Прокурор зьвярнуўся ў сенат з просьбай аб дазволе прыцягнуць да суду шмат дзяржаўных дзеячоў Латвіі, якія своімі машэньніцкімі апэрацыямі зрабілі вялікую шкоду рэспубліцы.

З нажом да горла.

Пасьля Францыі, Англіі і Італіі запатрабавалі ў Нямеччыны забастоўкі дзяржавы плат Нямеччыну [illegible] Францыю. Нямецкае [illegible] пагадзіцца прымушаны на гэтыя вымаганьні даць сваю згоду.

У панскай Польшчы.

Рыхтуюцца.

Па паведамленьню Ковенскага „Эха" Польшча рыхтуецца к новаму наступу на Літву. На гэты раз поля Жэлігоўскага будзе невялікай. Паляки думаюць выкарыстаць спосаб „Сілескага паўстаньня". Мысьляць, што выступленьне паўстанцаў пачнецца ў прымежных к Літве і Нямеччыне паветах Сувальскай губэрні. Сотні дэмабілізаваных афіцэраў і салдат польскай арміі знарок пераробліваюцца ў паўстанцаў. Заўважаюць вялікі рух перадзет й у цывільную форму грамады па грунтовых і брукованых дарогах Сувалшчыны.

„Кур'ер Паранны", мусіць ня мог захаваць „сьвятой" думкі паноў і пр баўтнуўся, што ў вырашэньні віленскага пытаньня патрэбна рабіць „так сама энэргічна, як мы вырашылі сілескае непаразуменьне".

Абмыліліся.

Паляки не давяраюць Лізе Нацыяў „Газэта Віленска" піша аб ёй гэтак: „Здрадніка Шарэдзіньні мы закідывалі тухлымі яйкамі і выкінулі з Вільні. Таго ж самага заслужывае і рашта сяброў, так званай, кантрольнай камісіі, якія езьдзяць к нам, як шпіёны. Дзе гэта чуваць, каб мы яшчэ рабілі грашовыя затраты на ўтрыманьне камісіі. Ня толькі ім, але і ў Лігу нацыяў так сама ня варта даваць ні граша, бо там сядзяць нашы ворагі, а ворагам грошаў ня плацяць.

Растрэльваюць рабочых.

Палявым суд у Львове прыгаворыў да сьмяртвай кары рабочых Воялоўскага і Будзінскага за забойства паліцэйскага.

Б'юцца, як рыба аб лёд.

Вадзіцкае панжаньне польскай маркі прымушае правіцельства шукаць крокаў, каб як небудзь падтрымаць каштоўнасьць яе. У зьвязку з гэтым паляки носяцца з праектам аб выпуску новых паперовых грошаў, забясьпечаных золатам.

Незалежнасьць кавводзтваў.

Па паведамленьню польскіх газэт у сойме паднята пытаньне аб незалежнасьці кавводзтваў.

Вымаганьні Польшчы.

Польскае правіцельства ставіць вось якія ўмовы заключэньня польска-чэхаславацкай згоды: 1) прызнаньне граніц згодна з Рыжскім дагаворам, 2) зьмішчэньне украінскіх арганізацыяў, 3) падтрыманьне ў верхня-сілескім пытаньні, 4) абразаваньне прадунайскай федэрацыі.

Што з гэтага будзе?

Ковенскія газэты не без страху паведамляюць, што польскія войскі атрымалі сакрэтны загад быць гатовымі ва ўсякую хвіліну рушыцца наперад дзеля вызваленьня прыгнечанага ў Літве польскага грамадзянства. Згодзецца мець запас харчоў на 10 дзён. Вузкая сіла польскага войска згрупіваліся ў раёне мандзячанскага чыгуначнага вузла. Агэнцыя „Орфэй" разасланла тэлеграму, у якой паведамляе, што на днях магчыма наступленьне Жэлігоўскага на Літву.

Што было ў Лодзі.

Ковенская газэта „Эха" паведамляе аб здарэньнях у Лодзі гэтак: „Ноччу на 15 жніўня ў Лодзі выбухнулі непарады між рабочымі, якія былі наведзены камуністамі. Некалькі дзесяткаў тысяч ткацкіх ткачоў выйшла на вуліцу, зрабіўшы мітынг, пры чым прыкуцы вымагалі павялічэньня заработку на 20 проц. Увесь дзень у Лодзі арасаваліся сьцягі польска-савецкай рэспублікі. Былі выбраны фабрычна-заводзкія саветы, і выбран Лодзінскі савет з прыкуцных. К вечару ўзвельнікі паўстаньня былі разагнаны войскамі і жандарамі. У Пазнані прымячалася тое самае.

Беларусь на дапамогу галадаючым.

Дзень дапамогі галадаючым у Менску.

Ужо з вечара 6 га жніўня па месту разыйшлися зборшчыкі. Прадажа значкоў у карысьць галадаючых адразу пайшла добра. На другі дзень ранцай, ня гледзячы на кепскую пагоду, камісія дню дапамогі шырока раскінула сваю працу. Сабраўшчыся мобілізаваныя артысты, на грузавых аўтамабілях з музыкай і палітпрацоўнікамі былі накіраваны ў розныя канцы гораду; адбыліся лятучыя канцерты мітынгі. Гаварылі прамовы т. т. Кюсе, Нодель, Левін, прадстаўнік Сяратоўскай губ. т. Браўерман і інш. Усе прафесыянальныя хаўрусы і савецкія установы, а гэтак сама й камандныя курсы вылучылі сваіх прадстаўнікаў для збору грошаў. Усе грамадзяне без выключэньня ахвотна давалі грошы. Было сабрана шмат грошаў, якія да гэтага часу яшчэ не падлічаны. Вечарам на ўсіх тэатрах адбыліся спэктаклі на карысьць галадуючых.

Чырвонаармейцы—галадаючым.

На агульнай сходцы чырвонаармейцаў жалезна-дарожнага палка быў заслуханы даклад аб становішчы ў Паволжы і ў другіх мяйсцовасьцях. Агульная сходка аднагалосна пастанавіла адлічыць двухтыднёвы паёк на карысьць галадаючых. Выбрана, гэтак сама, камісія дзеля збору ахвяраваньняў на карысьць галадаючых.

Супрацоўнікі Савету Прафэсыянальных Хаўрусаў Беларусі—галадаючым.

Агульная сходка супрацоўнікаў і камуністычная ячэйка Савету Прафэсыянальных Хаўрусаў Беларусі пастанавілі: адлічыць на карысьць галадаючых 20% пэнсіі за ліпень месяц і частку пайка, са звычайнага грамадзянскага пайка—2 ф., з ударнага—3 фунты і з адпаведнага—5 ф. мукі.

Белавак у дапамогу галадаючым

На агульным сходзе супрацоўнікаў Беларускага Камітэту перавозкі ўцекачоў па пытаньню аб дапамозе галадаючым Паволжа была зроблена вось якая пастанова: адлічыць на карысьць галадаючых 20% пэнсіі за ліпень м-ц, што складае 1.200.000 рублёў, і 10% пайковай мукі, круп і цукру за жнівень, вересень і кастрычнік м-цы, што складае 120 пудоў мукі, 30 пудоў круп і 9 пудоў цукру.

Двухтыднёвік дапамогі.

Палітычныя працоўнікі Н—кай дывізіі абвясьцілі сябе мабілізаванымі для правядзеньня „двухтыднёвіка дапамогі галадаючым Паволжа". Складаюцца палковыя тройкі, у якіх прымае ўдзел і камандны састаў. Больш сьвядомыя чырвонаармейцы й камуністы разсылаюцца па вёсках, для умацаваньня працы вясновых выканаўчых камітэтаў. Вайсковымі часьцямі праводзяцца мітынгі, выпускаюцца адозвы на тэму аб дапамозе галадаючым.

Міліцыянэры галадаючым.

На адчыненай сходцы Камуністычнай ячэйкі бабруйскай міліцыі з удзелам беспартыйных аднагалосна пастановлена адлічыць эканомію за месяц на карысьць галадаючых Паволжа і пачаць збор ахвяраў для гэтай жа мэты.

Добры прыклад.

Агульная сходка Мазырскага аддзяленьня саюзу мэдыцынскіх і санітарных працоўнікаў пастанавіла адлічыць 50% пэнсіі за ліпень, прадаць сад саюзу і на гэтыя грошы купіць хлеба для галадуючых. Агульны лік грошаў складзе каля 4.000.000 руб.

Беларуская вёска—галадаючым.

На пасяджэньні вал. выканаўчага камітэту Стаўпецкай вол., Бабруйскага пав. пастановлена было стварыць камітэт дапамогі галадаючым і зараз жа пачаць збор зярна для галадаючых. Для гэтага адпаведным працоўнікам даручана абезьдзіць усю волясьць і зрабіць збор зярна з кожнай гаспадаркі. Адначасна будзе вясьціся агітацыя для дапамогі галадаючым. Ёсьць надзея сабраць да 200 пуд. зярна. Палітасьветам будуць ставіцца спэктаклі, на якіх плата за білеты будзе брацца харчамі для галадаючых. Гаспадары камуністы асобна зробяць збор для галадаючых.

У мястэчку „Чырвоны Бераг" куляр.-асьвет. гурток арганізаваў спэктакль, на якім плата за білеты бралася зярнём, так сама для галадаючых.

Усім прыклад.

Сходка Мазырскай арганізацыі К. П. Б. 5 га жніўня пастанавіла адлічыць на карысьць галадаючых пэнсію за месяц і за паўмесяца паёк.

На закліканьне аддаць усё магчымае для галадаючых, першы адгукнуўся старшыня Выканаўчага Камітэту т. Лупкевіч, які аддаў для карысьці галадаючых свой заработны пярэвцёдак, на яго прыкладу пашлі й другія. Выдзелена тройка для збору ахвяраў.

Палавіну пайка і пэнсію галадаючым.

Сябры Саюзу грамадзянскага харчаваньня м. Бабруйску адгукнуліся на клічь Савецкай улады аб дапамозе галадаючым Паволжа.

Пастановлена адлічыць у працягу 2-х месяцаў 50% пайка і пэнсіі. Калектыўна гэтага ж Саюзу пастановлена адлічыць для галадаючых Паволжа 25 проц. ураджаю бульбы.

Розныя весткі.

Прагавітасьць расьце.

„Кур'ер Парановы" паведамляе, што жыхарства Мемельскай вобласьці ня згодна з праектам далучэньня Мемеля к Ковенскай Літве. Мемель па думцы газэты, жадае з эканамічнага погляду далучыцца да Польшчы.

Прагавітасьць павоў расьце ня гледзячы на тое, што яны атрымліваюць і што яшчэ ня вырашаны лёс Вільні.

Заява Пастоўскага.

Пастоўскі, які знаходзіцца ў Коўне і называе сабе правіцельствам беларускай народнай рэспублікі, зьвярнуўся да папы з заявай, у якой кажа, што ў Заходняй Беларусі ў вялікіх казарні гаворацца, на чужой для беларускага народу мове—польскай. Ён просіць папу, каб навучаньне катэхізісу і пропаведзі вяліся на беларускай мове, каб у духоўных семінарыях на тэрыторыі Беларусі выкладалася беларуская мова, гісторыя і літэратура, Апрача гэтага, ён заяўляе што ў Віленшчыне і Гарадзеншчыне польская ўлада перарабіла касьцёлы ў аддзяленьні палітычных партыяў, дае ўдзецца палітычная польская прапаганда. При гэтакіх умовах касьцёлы з'яўляюцца сродкамі прыгнечэньня беларускага насельніцтва.

Прыезд Савецкага прадстаўніка ў Польшчу.

У зьвязку з прыездам савецкага прадстаўніка начале з Карахаванам у Варшаву, польская газета „Наш Кур'ер" кажа аб патрэбнасьці праводзіць палітыку праўдзівага міру між Расеяй і Польшчай. Газета „Наруд" піша аб неабходнасьці ўхіліцца ўсіх непаразуменьняў і наладзіць добрасуседнія адносіны.

Як дэмабілізуецца Жэліхоўскі.

Ковенская газэта „Эха" паведамляе, што тыя чуткі якія распаўсюджваюцца Варшавай, аб тым, што армія Жэліхоўскага дэмабілізуецца, зьяўляюцца няпраўдай. Заграўды ж адбываецца перагрупаваньне войск, пры чым мяркуецца вядомыя мэты: замяніць войска Жэліхоўскага мясцовай міліцыяй; мець магчымасьць склікаць у Вільні сойм, а з другога боку войска Жэліхоўскага згрупаванае, у гэтак званыя „польскім валідоры"—кінуць у падходячую хвіліну на Літву.

Японцы ня выходзяць.

Вывад японскіх войск з Уладывастоку адложан да аднаўленьня гэўнага палітычнага становішча.

Што робіцца на Беларусі.

Новыя майстэрні.

БАБРУЙСК, 8/8. У вёсцы Харомцах, Лясковіцкай вол. пабудована сельска-гаспадарчая майстэрня. У Бр жацкай вол. майстэрня працуе вельмі добра. За два тыдні напраўлена 150 сярпоў, 25 кос, 5 плугоў і 50 др. іншых сельска-гаспадарчых прыладаў.

Град.

БАБРУЙСК, 8/8. У вёсках Стары Чуткаў, Сьліўка і маёнтку Амговічы, Горадаўскай вол. высыпаўшыся град зьніштожыў 50 дзесяцін азімага пасеву.

Нарада Савецкіх працоўнікаў.

СЛУЦАК, 8/8. Зьзываецца нарада саюзу савецкіх працоўнікаў. Будуць абгаварывацца пытаньні: новая эканамічная палітыка і культурна-асьветная праца.

Жывая газэта у вёсцы на беларускай мове.

БАБРУЙСК, 8/8 У сяле Лясковічах першы раз выпушчана жывая газэта на беларускай зразумелай мове. Газэта вельмі падабалася сялянам, якія прасілі часьцей чытаць для іх газэты.

Братэрскія адносіны.

(*Сьвіслацкая вол. Бабруйскага павету*)

Грамадзяне вёскі Малыткі і Дурашчыцы Сьвіслацкай волясьці зрабілі дабрахвотны збор харчоў для чырвонаармейцаў, якія жывуць па гэтых вёсках. У прысланых разам з харчамі лістох на імя камандзераў сяляне шлюць сваё прывітаньне баявым таварышам і падзяку за добрыя братэрскія адносіны. У гэтых адносінах чуваць моцная сувязь між чырвонаармейцамі й сялянамі.

Ударная праца.

БАРЫСАЎ, 8/8. Праца па правядзеньню харчовага налогу прызнана ўдарнай. Мабілізаваны 12 сяброў павятовага выканаўчага камітэту для правядзеньня налогу.

Канец бандытам.

(*Чырвоналуцкая волясьць*).

Пры вёсцы Другая-Студзёнка разьбіта шайка бандытаў. З іх 5 забіта, 3 памёрла ад ран на месьцы, 1 ранены захоплен. Адкрыта паўная сувязь з Савінкавым: знойдзены газэты, журналы і брашуры Савінкава. Банда складаецца з салдат і афіцэраў былых Балахоўскіх палкоў. Адзеты яны дрэнна. Большасьць у цывільнай форме, частка у польскай. Узброены хто чым папала—большасьць расейскімі вінтоўкамі.

Няшчасьце.

Пагост, Слуцкага павету.

Над вёскамі: Карысьць, Ганіца Тесоў Мецявічы і Сяньцо Пагосткай вол. Слуцкага павету 18 га ліпня правёсься буйны град, які зьнішчыў дашчэнту ўсю ярыну і да 75% вовіні.

Жыхары павінны будуць галадаць, яны чакаюць падмогі з боку ўлады.

Жыхар Карысьці

Збор харчовага налогу.

БАБРУЙСК, 8/8. У Гаўскай волясьці арганізавана тройка для збору харчовага налогу. Выканаўчы камітэт думае сабраць харчовы налог не пазьней 20-га жніўня.

СЛУЦК. 8/8. Для збору харчовага налогу на павет пасланы харчовыя інспэктары. Па ўсіх валасьцёх адбыліся сходкі сельскіх саветаў. Падгатоўчая праца йдзе шпарка. Да працы прыцягнены й настаўнікі. У кожную волясьць выехаў сябра павятовага выканаўчага камітэту.

Пачалася малацьба.

СЛУЦК 8/8. У савецкіх гаспадарках пакуль распачат абмалот збожжа. Будуць працаваць 7 паравых і 2 конных малатарні. Двейны ўдзел прыймаюць вайсковыя часьці. Да 20 га жніўня думаюць здаравіць 22400 пуд. зярна.

Змаганьне з голадам.

Пачатак збору.

КІЕЎ, 6—VIII. Па ўсёй Кіеўшчыне, Валыні, Падоліі і Херсоншчыне начаўся збор харчовага налогу. Партыйныя і прафесыянальныя працоўнікі, якія мабілізаваны дзеля гэтай справы разьехаліся па розных мясцох дзеля працы.

Збор на карысьць галадаючым.

Масква на карысьць галадаючым дала больш 8 мільёнаў руб., Ненець 4 мільёны, Гомель 2 мільёны, Орша больш 2 мільёнаў. У Пскове швейнікі робяць латарэю на 24 мільёны руб. У Торжку Пскоўскай губерні павятовы зьезд прафесыянальных саюзаў адлічыў галадуючым 7 мільёнаў руб. У Остраве збор даў больш 2 мільёнаў.

Адносіны Скандынаўскіх дзяржаваў да голаду у Расеі.

У Скандынаўскіх дзяржавах пачалася падгатоўка да дапамогі галадаючым Сав. Расеі. Нарвэжскае правіцельства адвяргнула рыбы на 700 тысячаў крон.

У Швэцыі арганізуецца дапамога грамадзянскімі сіламі пры ўдзеле нашых мясцовых таварышоў.

Одгукі на голад заграніцай.

У Парыжы францускі старшыня міністраў запрапанаваў паставіць на павестку дня Вярхоўнага Савету пытаньне аб дапамозе галадаючым Расеі.

Закупка насеньня заграніцай.

У хуткім часе мае прыбыць з Амерыкі 1 мілён пудоў насеньня. Пасьля гэтага будзе прывезена з Амерыкі яшчэ 4 мільёны пудоў насеньня.

Заграничная дэлегацыя камісіі дапамогі галадаючым.

Зацьверджан склад заграничнай дэлегацыі цэнтральнай камісіі дапамогі галадаючым пры Усерасейскім цэнтр. вык. камітэце. У склад дэлегацыі ўходзіць Максім Горкі, Хмчук і інш.

Чырвоны суд.

Народны суд над бандай Кузьняцова.

4 і 5-га жніўня г. г. ў Барысаўскім павеце выязная сесія Рэўтрыбуналу Н-ай дывізіі разьбірала справу 7 бандытаў і 7 укрывацеляў банды Кузьняцова. Банда гэта ў працягу двух гадоў шкодзіла насяленьню, забіваючы й рабуючы яго. На судзе з правам рашаючага голасу прысутнічалі й прадстаўнікі сялянства.

Разгледзіўшы гэту справу, Рэўтрыбунал прыгаварыў бандытаў да вышэйшай кары—расстрэлу.

Прыгавор выкананы 7 жніўня. Сяляне засім здаволены судом.

Ніхто ведаць забыцца, што яны ўсё робяць не схаваюцца ад суда працоўнага народу.

Бандыт Жукавец.

Рэўтрыбунал Заходняга фронту пры Н-ай стралковай дывізіі разгледзіў справу па абвінавачаньню гр. Жукаўца Самуіла ў бандытстве. Прыехаўшы ў водпуск з Чырвонай арміі, Жукавец разам з бандай, якая рабавала ў раёне вёскі Радунічы, Бабруйскага павету, зрабіў налёт на гэту вёску і забіў камуніста Паламейчыка і двух жыдоў. Пасьля арышту яго жонкі і канфіскацыі маемасьці Жукавец з'явіўся да ўлады, запасшися прыгаворамі сваіх аднасяльчан.

Жукавец быў арыштован за крадзіжы і забойствы некалькі разоў як Савецкай уладай, гэтак і акупацыйнымі, але кожны раз з пад стражы ўцякаў.

Рэўтрыбунал прысудзіў Жукаўца да вышэйшай кары—расстрэлу.

Па Менску.

У міліцыі.

Дзеля ўзмацненьня палітычнай і культурнай працы сярод міліцыянэраў, палітычны сэкратарыят гарадоўнага штабу міліцыі кожны тыдзень апрацоўвае плян працы на будучы тыдзень.

За апошнія дні былі прачытаны лекцыі аб рабочым руху ў Заходняй Эўропе і Амэрыцы.

Аб атпуску запасных матар'яла.

Разьмяркоўваючы аддзел запасных упраўленьня Беларусі прапануе ўсім Камісарыятам і групавым упраўленьням прысылаць заяўкі на патрэбу ў запасе, смалцы, газэ і мясных матар'ялах тэрмін з 1-га жніўня г. г. да 1 студзеня 1922 г. Без заявак па дня 20 жніўня г. г. ніякія водпуску рабіцца на будуць.

Парадак адпраўкі ўцекачоў

Камітэт перавозкі ўцекачоў даводзіць да агульнага ведама, што з прычыны вялікага наплыву ўцекачоў у Заходную вобласьць, а так сама дзеля большай правідловасьці і парадку адпраўкі іх на бацькаўшчыну, Камітэт у сваёй працы будзе прытрымлівацца вось якога парадку.

У першую чаргу будуць адпраўляцца ўцекачы, якія жывуць у абшчажыцьцях Камітэту. У другую чаргу—уцекачы, якія жывуць на ўтрыманьні Кам. Сацыяльнай Забясьпекі. І ў трэцьцюю чаргу—уцекачы, якія даўно жывуць у Менску.

Арганізацыя камуністычнай ячэйкі пры павятовым аддзеле сац. забясьпекі.

Адбыўся арганізацыйны сход ячэйкі пры павятовым аддзеле сац. забясьпекі.

Быў выслуханы даклад аб арганізацыі ячэйкі.

Запісалася ў ячэйку 3 беспартыйных, і зарэгістравалася адзін стары сябра партыі і адзін кандыдат.

Аб пайках выяжджаючых на курорты.

За ўсімі выяжджаючымі на курорты, згодна пастанове курортнай камісіі, застаецца права адтрымліваць палову асноўнага пайка, які адтрымліваўся да з'езду на курорт. У прадпрыемствах, дзе уведзена супольная дастава рабочым, на тых, хто адпраўляецца на курорты, застаўляюцца асобныя сьпісы дзеля адтрыманьня паловы пайка з кампроду.

Аб з'ездах прафэсыянальных саюзаў.

З'езды аддзельных саюзаў павінны быць праведзены ў працягу часу між 15 жніўня і 30 кастрычніка. Выключэньне можа быць дапушчана для саюзу працаўнікоў зямлі і лесу з прычыны ўборкі ўраджаю. Павятовыя канфэрэнцыі павінны склікацца павятовымі бюро прафесыянальных саюзаў.

Прэзыдыум прапануе друкаваным органам Савету праф. саюзаў распачаць перадзъездавую прапаганду, якой трэба зьвярнуць увагу на пытаньне аб супольнай даставе, ахове працы і арганізацыйных пытаньнях.

АБВЕСТКА.

За апошнія часы ў Гарадзкім аддзеле Картачнай сыстэмы прыкмячаецца наплыў заяваў аб згубленьні картак. Гэта паказвае, што неаднаразовыя зьвяртаньні аддзелу аб добрым захаваньні картак дарэмны. Гэта зьявішча прымушае Менскі Гарадзкі Аддзел Картачнай сыстэмы павялічыць кантроль пры выдачы дазволеньняў на выдачу дублікатаў, бо могуць быць выпадкі не запраўднага згубленьня, і стаць на той шлях, на які даўно сталі сталічныя і шмат правінцыянальных установаў Картачнай сыстэмы.

З цяперашняга часу дублікаты будуць выдавацца толькі ў самых выключных выпадках і не раней, чым праз месяц з дню падачы заявы аб згубленьні картачкі. Такім парадкам не беражлівае хаваньне картачак выкліча сабой неатрыманьне пайка за цэлы месяц (службовага ці дзіцячага).

Даводзячы аб гэтым да агульнага ведама Менскі Гарадзкі аддзел Картачнай сыстэмы ў астатні раз зьвяртаецца з прапанаваньнем добра хаваць харчовыя карткі, каб ухліцца перарываў у атрыманьні пайка.

6-я Савецкая пэкарня (Інваліцк...